**КІ́ЕВА-ПЯЧЭ́РСКІ ПАЦЯРЫ́К**, помнік агіяграфічнай старажытнарускай літаратуры. Зб. дыдактычных апавяданняў, прысвечаных гісторыі заснавання Кіева-Пячэрскага манастыра (сярэдзіна 11 ст.), а таксама жыццю і дзейнасці яго манахаў. Твор меў шматлікія літ. рэдакцыі. Першапачатковы тэкст з'явіўся ў 1220-я гг. (не захаваўся), калі пачалі ліставанне ўладзіміра-суздальскі епіскап Сімон і пячэрскі манах Палікарп. Захавалася некалькі спісаў пач. 15 — 17 ст., упершыню надрукаваны ў Кіеве ў 1661. Нагодай для ліставання было «нясціплае» памкненне манаха да высокіх царк. пасад («А ты, брат мой, ці не епіскапства пажадаў?»). У «Пасланні» да Палікарпа Сімон павучае яго, заклікае пакаяцца і «вярнуцца да ціхага і немітуслівага жыцця» ў «святым месцы». Да «Паслання...» епіскап дадае 9 апаведаў аб жыцці пячэрскіх святых. Кожны з манахаў паказаны як ідэальны хрысціянін, які ахвяраваў жыццё Богу і людзям. Апроч агіяграфічных тэкстаў, у К.-П.п. уваходзіць «Слова аб стварэнні Пячэрскай царквы», напісанае таксама Сімонам. Складанне зб. працягнуў духоўны вучань епіскапа манах Палікарп. Ён напісаў «Пасланне ігумену Пячэрскага манастыра» і дадаў апавяданні пра святых. Прыблізна ў 13 ст. да твораў, напісаных Сімонам і Палікарпам, было далучана «Слова пра першых чарнарызцаў пячэрскіх», як лічыцца, за-

Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова

пазычанае з «*Аповесці мінулых гадоў*». Гэтыя тэксты склалі аснову К.-П.п., які ў пазнейшыя часы дапаўняўся інш. тэкстамі адпаведнага жанру. Пашырык аказаў вял. ўплыў на развіццё агіяграфічнай л-ры ўсх. славян.

*В.І.Еўмянькоў.*

...ный архив библиотеки МГУ имени А.А....